Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Нацыянальны інстытут адукацыі

# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ
# Ў СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

## Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў па гісторыі Беларусі для вучняў VIII класа агульнаадукацыйных устаноў

Аўтар-складальнік: С. А. Кудраўцава

Мінск 2009



Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

## Структура і склад
## дыдактычных матэрыялаў для правядзення факультатыўных заняткаў

**1.** Уводзіны.

**2.** Матэрыялы па раздзелах праграмы факультатыўных заняткаў "Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай":

крыніцы гістарычнай інфармацыі: дакументы і матэрыялы, якія раскрываюць асноўныя падзеі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця беларускіх зямель ў час існавання Рэчы Паспалітай; мемуары, успаміны, запіскі палітычных дзеячаў, простых грамадзян, паслоў і інш.

метадычны апарат: пытанні і заданні да гістарычных крыніц;

хрэстаматыйная, вучэбная, навукова-папулярная літаратура для вучняў на друкаваных і электронных носьбітах;

паняційна-тэрміналагічны і біяграфічны даведнік.

## Тлумачальная запіска



Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

*Актуальнасць* правядзення факультатыва абумоўлена неабходнасцю вывучэння айчыннай гісторыі, як аднаго з найважнейшых фактараў грамадзянскага, патрыятычнага і гуманістычнага выхавання падрастаючага пакалення. Без глыбокіх і трывалых ведаў гісторыі сваёй краіны немагчыма паспяхова будаваць грамадскае жыццё ў сучаснасці і ў будучым.

*Мэта* факультатыўных заняткаў заключаецца ў авалоданні васьмікласнікамі ведамі аб мінулым Бацькаўшчыны ў перыяд знаходжання беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай, далучэнні да нацыянальных і сусветных культурных традыцый і каштоўнасцей праз вывучэнне крыніц гістарычнай інфармацыі.

*Задачамі* факультатыва з’яўляюцца:

сістэматызацыя і абагульненне гістарычных ведаў аб гісторыі Беларусі другой паловы XVI – XVIII стст.;

развіццё пазнавальных, творчых інтарэсаў і інтэлектуальных здольнасцей вучняў;

фарміраванне навыкаў і ўменняў у вучняў прэзентаваць даследаваны матэрыял са спасылкай на ўласны вопыт, навуковыя крыніцы і іншыя сродкі інфармацыі;

выхаванне грамадзянскай пазіцыі і пачуцця патрыятызму

Вызначаныя мэты і задачы рэалізуюцца ў розных метадах і прыёмах, накіраваных на развіццё творчай актыўнасці, пазнавальнага інтарэсу вучняў: праца з крыніцамі гістарычнай інфармацыі, пісьмовыя і вусныя творчыя работы вучняў, гульня, абарона праектаў, прэзентацыя з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій, напісанне творчых работ (эсэ, рэфераты) і інш.

Праграма факультатыўных заняткаў разлічана на 35 гадзін.

## ЗМЕСТ

**Уводзіны** (1 гадз.). Характарыстыка крыніц гістарычнай адукацыі. Правілы работы з гістарычнымі дакументамі.

### РАЗДЗЕЛ I. Беларусь у другой палове XVI — першай палове XVII ст. (12 гадз.)

**Лівонская вайна.** Прычыны і пачатак. Поспехі войска Рускай дзяржавы. Страта Полацка. Ваенныя дзеянні ў 1579—1581 гг. Заключэнне і ўмовы Ям-Запольскага перамір’я (1582).

**Люблінская унія. Утварэнне Рэчы Паспалітай.** Перадумовы аб’яднання Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. Прычыны ўтварэння Рэчы Паспалітай. Люблінскі сейм. Акт 1 ліпеня 1569 г. Умовы аб’яднання Кароны Польскай і Вялікага княства Літоўскага.

**Дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай.** Вышэйшыя органы дзяржаўнай улады. Сейм Рэчы Паспалітай. Кароль Рэчы Паспалітай. “Залатыя вольнасці” шляхты. Судовая сістэма.

**Палітычнае становішча Вялікага княства Літоўскага ў апошняй трэці XVI – пачатку XVII ст.** Рэакцыя ВКЛ на вынікі уніі з Польшчай. Захаванне агульнадзяржаўных соймаў ВКЛ. Стварэнне Галоўнага Трыбунала ВКЛ. III Статут ВКЛ 1588 г. і яго значэнне.

**Знешнепалітычнае становішча Рэчы Паспалітай у першай палове XVII ст.** Барацьба Рэчы Паспалітай са Швецыяй. Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Расійскую дзяржаву. Дэўлінскае перамір’е. “Смаленская” вайна. Паляноўскі мір.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове XVI – першай палове XVII ст.** (2 гадз.). “Устава на валокі” 1557 г. Феадальныя павіннасці і дзяржаўныя падаткі сялян. Рост і ўзбуйненне гарадоў. Гарадское рамяство. Цэхавая арганізацыя. Купецкія карпарацыі. Унутраны і знешні гандаль. Сацыяльныя супярэчнасці і канфлікты ў вёсцы і гарадах.

**Рэфармацыя ў Беларусі.** Перадумовы рэфармацыйнага руху. Пашырэнне Рэфармацыі ў Беларусі. Асаблівасці і асноўныя этапы рэфармацыйнага руху ў Беларусі. Кальвінізм. Арыянства. Дзеячы Рэфармацыі (Мікалай Радзівіл Чорны, С. Будны, В. Цяпінскі). Вынікі і значэнне рэфармацыйнага руху.

**Контррэфармацыя ў Беларусі.** Асноўныя напрамкі Контррэфармацыі. Пачатак і пашырэнне дзейнасці Ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі. П. Скарга. Вынікі Контррэфармацыі ў Беларусі.

**Берасцейская царкоўная унія.** Перадумовы заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі. Падрыхтоўка Берасцейскай царкоўнай уніі. Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г. і яго значэнне. Гвалтоўнае насаджэнне уніяцкай царквы ў канцы XVI – пачатку XVII ст. Уніяцкія дзеячы (І. Кунцэвіч). Пашырэнне уніяцтва сярод сельскага насельніцтва і гарадскіх нізоў.

**Пашырэнне ўплыву Адраджэння на беларускія землі.** Кнігадрукаванне. Літаратура рэлігійная і свецкая. Грамадска-палітычная і філасофская думка. Выяўленчае мастацтва. Дойлідства.

**Практычная работа.**

## РАЗДЗЕЛ II. Беларусь у другой палове XVII — першай палове XVIII ст.
(11 гадз.)

**Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. на беларускіх землях.** Прычыны казацка-сялянскай вайны. Казацкія "загоны" у Беларусі. Баявыя дзеянні казацка-сялянскіх атрадаў супраць шляхецкага войска на поўдні Беларусі. Бітвы пад Лоевам. Вынікі і наступствы казацка-сялянскай вайны.

**Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай у 1654–1667 гг.** Прычыны вайны і суадносіны сіл. Пачатак баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі. Палітыка цара Аляксея Міхайлавіча. Адносіны насельніцтва да варагуючых бакоў. Кейданская унія 1655 г. Баявыя дзеянні ў першай палове 1660-х гг. Віленскае перамір'е. Вызваленне тэрыторыі Беларусі. Андросаўскае перамір'е.

**Беларусь у Паўночнай вайне.** Перадумовы Паўночнай вайны і яе пачатак. Абвастрэнне ўнутрыпалітычнага супрацьстаяння ў ВКЛ. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Бедствы насельніцтва Беларусі. Вынікі і наступствы вайны.

**Унутрыпалітычнае становішча Беларусі ў першай палове XVIII ст. Барацьба магнацкіх груповак.** Паслабленне цэнтральнай улады і пашырэнне шляхецкай анархіі. Канфлікты паміж магнацкімі родамі. "Хатняя" вайна 1696–1700 гг. Стварэнне шляхецкіх канфедэрацый прыхільнікаў Аўгуста II і Станіслава Ляшчынскага ў гады другой Паўночнай вайны. Сойм 1717 г. і яго значэнне. Нарастанне расійскага ўплыву ў Рэчы Паспалітай. Вайна за «Польскую спадчыну» (1733 – 1739).

**Беларуская вёска ў другой палове XVII – першай палове XVIII ст.** Заняпад вёскі падчас войнаў другой паловы XVII – пачатку XVIII ст. Аднаўленне сялянскай гаспадаркі. Рост прыгонніцкай эксплуатацыі сялян. Сялянскія павіннасці і землеўладанне. Юрыдычнае становішча сялянства.

**Сялянскі рух.** Супраціўленне сялян узмацненню феадальнага прыгнёту. Формы антыфеадальнай барацьбы. Паўстанне сялян ў Крычаўскім старостве. Паўстанне на Каменшчыне.

**Гарады Беларусі ў другой палове XVII — першай палове XVIII ст.** Заняпад гарадоў ў час ваеннага ліхалецця. Аднаўленне гарадскога жыцця. Гарады ў першай палове XVIII ст. Гандаль у першай палове XVIII ст. Першыя кірмашы. З'яўленне мануфактурнай вытворчасці.

**Адукацыя і навука.** Гістарычныя ўмовы развіцця культуры. Забарона на ўжыванне беларускай мовы ў справаводстве. Праваслаўныя брацтвы і іх дзейнасць. Сістэма адукацыі (каталіцкія, пратэстанцкія, праваслаўныя, уніяцкія школы). Навука.

**Літаратура і грамадска-палітычная думка.** Мясцовае летапісанне. Мемуарыстыка. Палітычная сатыра. Творчасць Сімяона Полацкага. Грамадска-палітычная думка.

**Архітэктура і мастацтва.** Барока ў архітэктуры Беларусі. Віленскае барока. Партрэтны жанр. Батлейка. Школьны тэатр. Царкоўная музыка. "Полацкі сшытак". Арганная музыка. Капэлы.

**Практычная работа.**

**Раздзел III. Беларусь у другой палове XVIII ст.** (10 гадз.)

**Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай.** Умяшальніцтва суседніх дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. Дысідэнцкае пытанне. Барская канфедэрацыя. Першы падзел Рэчы Паспалітай.

**Спробы рэфармавання Рэчы Паспалітай.** "Чатырохгадовы сейм" (1788–1792) і значэнне яго рашэнняў для Беларусі. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Таргавіцкая канфедэрацыя. Другі падзел Рэчы Паспалітай.

**Паўстанне 1794 г. і яго падзеі ў Беларусі. Канец Рэчы Паспалітай** (2 гадз.). Падрыхтоўка, пачатак і мэты паўстання. Ход паўстання. Асаблівасці паўстання ў Беларусі і Літве. Паражэнне паўстання. Трэці падзел Рэчы Паспалітай.

**Эканамічная стабілізацыя ў другой палове XVIII ст.** Феадальная гаспадарка. Эканамічныя рэформы ў другой палове 60-х гг. XVIII ст. Аграрная рэформа А. Тызенгаўза. Стан гарадоў. Магнацкае прадпрымальніцтва.

**Адукацыя і навука.** Асаблівасці Асветніцтва ў Беларусі. Школьная рэформа. Стварэнне і дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Арганізацыя першых прафесійных навучальных устаноў. Развіццё навукі.

**Літаратура і мастацтва.** Асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў другой палове XVIII ст. Друк. Палацава-замкавае будаўніцтва. Прыгонны тэатр. Выяўленчае мастацтва. Віленская мастацкая школа. Музычнае мастацтва. Прыгонныя капэлы і аркестры.

**Народная культура.** Асаблівасці развіцця народнай культуры. Побыт сялян і мяшчан. Светапогляд і абраднасць жыхароў вёскі і горада. Фальклор.

**Практычная работа.**

**Заключэнне.**

# ЧАКАЕМЫЯ ВЫНІКІ

На факультатыўных занятках вучні:

засвойваюць веды аб асноўных падзеях, з'явах, працэсах грамадска-палітычнага развіцця ў другой палове XVI — XVIII стст.;

атрымліваюць уяўленне аб гістарычных дзеячах і дзеячах культуры, асобных здабытках духоўнай культуры беларускага народа.

Факультатыўныя заняткі спрыяюць фарміраванню наступных ўменняў:

параўноўваць гістарычныя з'явы, падзеі, вызначаць месцазнаходжанне гістарычных аб'ектаў на гістарычнай карце;

удасканальваць уменні аналізаваць грамадскія з'явы і працэсы, вызначаць прычынна-следчыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі;

развіваць даследчыцкія уменні.


Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

## ЛІТАРАТУРА


1. 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур. — Мінск, 2008.
2. Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыклапедыя. — Мінск, 1993.
3. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. — Мінск, 1985.
4. Асветнікі зямлі беларускай. X – пачатак XX ст. : энцыклапедычны даведнік. — Мінск, 2001.
5. Атлас гісторыі Беларусі, ад старажытнасці да нашых дзён. — Мінск, 2006.
6. Беларусазнаўства; пад рэд. П. Брыгадзіна. — Мінск, 1998.
7. Беларускія летапісы і хронікі / укладанне У. Арлова. — Мінск, 1997.
8. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. — Мінск, 2000.
9. Белоруссия в эпоху капитализма. Сборник документов и материалов. — Мінск, 1990. — Т. 1.
10. Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов. В 4-х кн. — Минск, 1959—1979.
11. Бохан, Ю. М. Вайсковая справа ў Вялікім княстве Літоўскім у другой палове XIV — канцы XVI ст. — Мінск, 2008.
12. Верашчагіна, А., Гурко, А. Гісторыя канфесій у Беларусі. — Мінск, 2000.
13. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. — Мінск, 2003.
14. Вішнеўскі, А. Ф., Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах. — Мінск, 2003.
15. Вялікае Княства Літоўскае: энцыклапедыя: У 2 Т. — Мінск, 2005—2006.
16. Вялікі гістарычны атлас Беларусі / гал. рэд. В. Л. Насевіч. — Мінск, 2008. — Т. 1.
17. Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы / М. Біч, Р. Гарэцкі, У. Конан [і інш.]; рэдкал: У. Арлоў [і інш.]. — Мінск, 2006.
18. Гісторыя Беларусі (канец XVIII в. – 2002 г.): хрэстаматыя: 11 клас; пад рэд. Я. К. Новіка. — Мінск, 2003.
19. Гісторыя Беларусі. З 1795 г. да вясны 1917 г.: вучэб. дапам.; рэд. кал. І. П. Крэнь, І. І. Коўкель. — Мінск, 2001.
20. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Курс лекцый / П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў, П. І. Зялінскі [і інш.]. — Мінск, 1998, 2002.
21. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. — Мінск, 2007.
22. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск, 2000—2005.
23. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. — Мінск, 1971—1975.
24. Голенченко, Г. Я. Идейные и культурные связи восточнославянских народов в XVI — середине XVII в. — Минск, 1989.

25. Дзмітрачкоў, П. Ф. Беларусь у сярэдневяковы перыяд (V – першая палова XIII ст.). — Магілёў, 2007.
26. Довнар-Запольский, М. В. История Белоруссии. — Минск, 2003.
27. Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Литовское и Белорусское Полесье: репринт. воспроизведение изд. 1882 г. — Минск, 1994.
28. Жывапіс Беларусі XII—XVIII стагоддзяў. Складальнікі: Н. Ф. Высоцкая, Т. А. Карповіч. — Мінск, 1980.
29. Загорульский, Э. М. Древняя история Беларуси: очерки этнической истории и материальной культуры (до IX в.). — Минск, 1977.
30. История Беларуси в документах и материалах / авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. — Минск, 2000.
31. Ігнатоўскі, У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. — Мінск, 1991.
32. Ілюстраваная гісторыя. Краіна Беларусь, 2003.
33. Ілюстраваная храналогія гісторыі Беларусі / аўт.-склад. І. П. Хаўратовіч. — Мінск, 1995.
34. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII — XX ст.). / навук. рэд. У. І. Навіцкі. — Мінск, 1998.
35. Кніга для чытання па гісторыі Беларусі (канец XVIII — 1917 г.): 8 кл.; аўт.-склад. Н. Я. Новік. — Мінск, 2007.
36. Ковкель, И. И., Ярмусик, Э. С. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени. — Минск, 2003.
37. Лазука, Б. А. Гісторыя мастацтваў. — Мінск, 2003.
38. Ластоўскі, В. Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. — Мінск, 1992.
39. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедычны даведнік. — Мінск, 1995.
40. Мяснікоў, А. Ф. Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты. — Мінск, 2008.
41. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч.; пад рэд. М. П. Касцюка. — Мінск, 1994. — Ч. 1.
42. Новік, Я. К. [і інш.]. Гісторыя Беларусі: ад старажытных часоў - па 2008 г.: вучэб. дапам. / пад рэд. Я. К. Новіка. — Мінск : Вышэйш. шк., 2009.
43. Падокшын, С. А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры. Мінск, 2003.
44. Падокшын, С. А. Унія. Дзяржаўнасць Культура: філасофска-гістарычны аналіз). — Мінск, 1998.
45. Парашкоў, С. А. Гісторыя культуры Беларусі. — Мінск, 2003.
46. Пичета В.И. История белорусского народа. — Мінск, 2003.
47. Рэлігія і царква на Беларусі: энцыклапедычны даведнік. — Мінск, 1991.
48. Славутыя імёны Бацькаўшчыны. — Мінск, 2000, 2003. — Вып. 1—2.
49. Ткачоў, М. А. Замкі і людзі. — Мінск, 1991.
50. Трещенок, Я. И. История Беларуси: учеб. пособие: в 2 ч. Досоветский период. — Могилёв, 2004. — Ч. 1.



Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

51. Уния в документах. Сборник документов и материалов; сост. В. А. Теплова, З. И. Зуева. — Минск, 1997.

52. Хрестоматия по истории Беларуси. С древнейших времён до 1917 г. / сост. Я. И. Трещенок; под науч. ред. К. М. Бондаренко. — Мінск, 2008.

53. Цітоў, А. К. Гарадская геральдыка Беларусі. — Мінск, 1989.

54. Чигринов, П. Г. Очерки истории Беларуси: учеб. пособие. — Минск, 2006.

55. Шалькевич, В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. — Минск, 2002.

56. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэб. дапам.; пад агул. рэд. В. І. Галубовіча. — Мінск, 2005.

57. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. — Мінск, 1993–2003.

58. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. — Мінск, 1989.

59. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. — Мінск, 2000, 2003.

60. Ярмусик, Э. С. Католический костёл в Беларуси в 1945—1990 годах. — Гродно, 2006.